*Грыбава І.Р. (БрДТУ, Брэст)*

## "ГЛАБАЛЬНАЯ ЭТЫКА" І АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Паняцце "каштоўнасць" шырока выкарыстоўваецца ў сучасным навуковым лексіконе. Яно акрэслівае культурнае, сацыяльнае, асобаснае значэнне з'яў рэчаіснасці. Кожнаму грамадству на канкрэтным гістарычным этапе развіцця ўласцівы спецыфічны набор і іерархія каштоўнасцей. Яны змяняюцца ў працэсе пераўтварэння грамадства. Адзначым, што праблема каштоўнасцей у самым шырокім значэнні абвастралася ў часы абясцэнення культурных традыцый, крушэння былых ідэалагічных асноў грамадства. Адзначаныя працэсы адбываюцца ва ўсім свеце. Асэнсоўваючы гістарычны вопыт, будучыню, грамадства ўсе больш аддае перавагу ідэі прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей (у адносінах да класавых, групавых). Да агульначалавечых каштоўнасцей традыцыйна адносяць свабоду, шчасце, каханне, сям'ю, дзяцей, самакаштоўнасць чалавечага жыцця і інш. Такія маральныя якасці як любоў да працы, сумленне, гонар, годнасць, абавязак, адказнасць, спачуванне і інш. Таксама права чалавека на творчасць (у сферы маралі ў тым ліку), патрыятызм, гуманізм. Апошні разумеецца як ядро і сувязнае звяно агульначалавечых каштоўнасцей.

Складанасць даследвання прыроды агульначалавечых каштоўнасцей заключаецца ў наступным: да іх нельга падыходзіць як да спрадвечнай данасці чалавецтву, як чамусьці прыроднаму. Не мае сэнсу адшукваць агульначалавечыя каштоўнасці ў грамадстве, дзе частка людзей такімі не лічылася, дзе яшчэ не існавала паняцце "чалавецтва".

Мы падзяляем вядомы пункт гледжання, што з эпохі Асветы пачынаецца працэс станаўлення агульначалавечых каштоўнасцей, гуманістычнага светапогляду, што гуманізм непазбежна набывае абстрактны характар у выніку наяўнасці класавых супярэчнасцей.

У XIX - XX стагоддзях агульначалавечыя каштоўнасці грунтуюцца на ўтвараючайся сусветнай гаспадарцы, усесветных палітычных, культурных і сацыяльных арганізацыях, дэмакратызацыі палітычнага жыцця ўнутры развітых краін. Ужо ў сярэдзіне XX стагоддзя гуманістычны, агульначалавечы змест новых каштоўнасцей прадстаўляе сабой канкрэтную задачу. Чалавецтва сутыкаецца з набліжаючыміся катастрофамі (перавытворчасць сродкаў масавага знішчэння, экалагічнай і інш.). За апошнія дзесяцігоддзі ў свеце адбылося нямала катастроф, стыхійных бедстваў, лакальных узброеных канфліктаў, тэрарыстычных актаў. Яны дэманструюць міру агульнасць інтарэсаў жыхароў Зямлі, узаімасувязь працэсаў у свеце. Напэўна іншую прыроду маюць агульначалавечыя каштоўнасці ў кантэксце тых глабальных праблем, якія стаяць перад чалавецтвам. Умовай вырашэння гэтых праблем могуць стаць толькі маральныя патрабаванні, якія абвяшчаюць памяркоўнасць, маральны плюралізм, канкрэтны гуманізм.

Чаму ў канцы XX стагоддзя назіраецца ажыўленне ідэй гуманізму? Чаму віднейшыя вучоныя свету выступілі за стварэнне глабальнай этыкі для ўсяго чалавецтва? Таму што ўзаемазалежнасць народаў, дзяржаў стала відавочнай.

У працэсе глабалізацыі дзейнасць людзей у тых жыццёва-значных аспектах, якія вызначаюцца ўзроўнем развіцця навукі і тэхнікі, робіцца сістэмна-арганізаванай, адзінай у маштабе ўсяго чалавецтва. Але ў той частцы, у якой дзейнасць людзей залежыць ад іх каштоўнаснага выбара, этыка-культурнай ідэнтычнасці, чалавецтва застаецца цывілізацыйна разнастайным, раздзеленым. У якасці выхада з гэтай супярэчнасці прапаноўваюцца некалькі напрамкаў. Адзін з іх арыентаваны на творчы сінтэз і зліццё культур у будучыні. Як вынік - нараджэнне чагосьці аднаго і зусім новага. Другі - арыентаваны на дамінаванне каштоўнасцей адной, заходнееўрапейскай культуры. Трэці - прапаноўвае роўнасны дыялог усіх культур.

У 1988 годзе ў Злучаных Штатах Амерыкі адбыўся дзесяты Ўсесветны Кангрэсс Міжнароднага гуманістычнага і этычнага Саюза. На ім была падпісана "Дэкларацыя ўзаемазалежнасці: новая Глабальная этыка". У Дэкларацыі, напрыклад, адзначаецца, што свет падзелены на розныя этнічныя і нацыянальныя супольнасці. Кожны чалавек мае спецыфічныя маральныя абавязкі перад гэтымі суполкамі. Аднак існуюць асноўныя маральныя прынцыпы, якія звязваюць усе цывілізаваныя суполкі свету. У гэтых прынцыпах - калектыўны вопыт чалавецтва. Гэта патрэбнасць у праўдзе, вернасць абяцанню, шчырасць, гонар, даверлівасць, лаяльнасць, удзячнасць, справядлівасць, цярпімасць, супрацоўніцтва. Час запатрабаваў не толькі абвясціць усеагульнасць гэтых прынцыпаў, але і распаўсюдзіць іх на ўсе чалавецтва. Вельмі важным уяўляецца стварэнне першаснага Усесветнага этычнага кансэнсусу, у якім будуць сфармуляваны нашы правы (свабоды) і абавязкі (адказнасць) перад чалавецтвам.

"Глабальная этыка" (правы ўсіх грамадзян Зямлі) уключае:

1. Права асобы на бяспеку і самаабарону.
2. Права асабістай свабоды, якое прадугледжвае:
   а) свабоду ад насільніцкага зняволення,
   б) свабоду думак, слова, сумлення;
   в) маральную свабоду на асабісты стыль жыцця, з умовай што ен не шкодзіць іншым і не перашкаджае ім сцвярджаць свае правы.
3. Права на недатыкальнасць асабістага жыцця, што азначае павагу праў іншых людзей на:
   а) канфідэнцыяльнасць,
   б) выбіранне сексуальнага партнера,
   в) жыццевыя стандарты,
   г) працяг свайго рода,
   д) кантроль нараджальнасці;
   е)медыцынскую дапамогу,
   ж) годную смерць.
4. Права на інтэлектуальную і культурную свабоду, менавіта:
   а) свабодны пошук і правядзенне даследванняў,
   б) права на адукацыю,
   в) на далучэнне да культурных каштоўнасцей,
   г) права на выказванне любых поглядаў.
5. Свабоду ад нястачы, што прадугледжвае:
   а) гарантыі грамадсва на працу,

б) дапамогу састарэлым,

в) дапамогу людзям, што пакутуюць ад якіх-небудзь недахопаў, якія ўплываюць на іх працаздольнасць,

г) права на адпачынак і рэлаксацыю.

6. Эканамічную свабоду, уключаючы права на прыватную ўласнасць, абарону ад махлярства.
7. Маральную роўнасць, што прадугледжвае роўныя магчымасці і аднолькавы доступ да ўсіх даброт.
8. Роўнасць перад законам як жыццева неабходная ўмова свабоднага грамадства. Яна ўключае права на справядлівы судовы разбор, на гуманнае абыходжанне і г. д.
9. Грамадзянскія свабоды:

   а) права голаса,

   б) юрыдычна замацаванае права на апазыцыю,

   в) права на сходы,

   г) права на рэлігійныя перакананні.

10. Права на брак і сям'ю, менавіта:

    а) права заключаць брак ці жыць сумесна,

    б) нараджаць і гадаваць дзяцей,

    в) планаваць сям'ю.

11. Права дзяцей на абарону ад жорсткага абыходжання.

Прызнанне ўсеагульнасці пералічаных свабод накладае на кожнага чалавека маральную адказнасць. Па-першае, гэта адказнасць перад сабой - за асабістае здароўе, за інтэлектуальнае і маральнае развіцце, матэрыяльны дабрабыт і г. д. Па-другое, адказнасць перад іншымі людзьмі. Напрыклад - бацькоў перад дзецьмі, дзяцей перад бацькамі. Па-трэцяе, маральную адказнасць у штодзенных адносінах у малых групах (напрыклад, паміж кіраўніком і падначаленымі, настаўнікам і вучнямі і г. д.). Па-чацвертае, адказнасць грамадзяніна перад Радзімай, перад сусветнай суполкай (як прадстаўніка чалавецтва, як жыхара Зямлі, як часткі сусветнай суполкі). Такім чынам, мы абавязаны сфарміраваць новае пачуцце агульнасці з грамадствам у маштабах усей планеты, улічваючы нашы абавязкі, адказнасць перад народамі і дзяржавамі, грамадзянамі якіх з'яўляемся.

XXI стагоддзе патрабуе асэнсавання адказаў на шматлікія пытанні, сярод якіх:

- як супрацоўнічаць, каб стварыць квітнеючы свет, пераадолець міжнацыянальнае, міжканфесійнае саперніцтва,
- як падтрымліваць пачуцце ўласнай годнасці кожнага чалавека,
- як будаваць міравое супольніцтва?

Адказы на гэтыя пытанні можна знайсці толькі ў свеце каштоўнасцей новай маралі, заснаванай на ідэалах гуманізма і асэнсаванай, напрыклад, у рамках як Дэкларацыі "Глабальнай этыкі", так і ў "Дэкларацыі аб глабальнай этыцы", якая была прынята Парламентам рэлігій свету у 1993 годзе (г. Чыкага). Калі ў новым сусветным парадку ўзнікае агульнасць патрэбнасцей сярод грамадзян свету, то можа скласціся глабальная культура, якая ўключае і глабальную этычную сістэму.